**Заключение.** И все же, подводя итоги проведенной работы во время демобилизации третьей очереди, следует сказать, что, невзирая на выявленные недостатки, государственными структурами была проделана значимая работа в трудоустройстве воинов Красной Армии, их адаптации и закреплении в народно-хозяйственный комплекс БССР.


Список литературы

1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946-2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 728.
2. Государственный архив Витебской Области. – Ф. 1-п. – Оп. 1. – Д. 470. – Л. 54.
3. ГАВО. – Ф. 1-п. – Оп. 2. – Д. 34, Л. 129.
4. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 4-п. – оп. 47. – Д. 72. – Л. 251.
5. Государственный архив общественных объединений Гродненской области. – Ф. 1. – оп. 1. – Д. 68. – Л. 7.
6. ГАВО. – Ф. 322. – Оп. 3. – Д. 64, Л. 34–35.


## “ЧОРНЫ” ДОМ – ПОМНІК ДРАЎЛЯНАГА МАДЭРНУ Ў ВІЦЕБСКУ


*М.В. Півавар*

*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Рэпазіторый ВГУ

Па шэрагу прычын у нашай краіне захавалася не значная колькасць помнікаў гісторыі і культуры XIX стагоддзя. Асабліва мала помнікаў, якія належаць да стылю мадэрн. На працягу гісторыка-краязнаўчай практыкі, якая праводзіцца на 1-м курсе гістарычнага факультэта, былі выяўлены шэраг аб’ектаў, якія можна аднесці да помнікаў гісторыі і культуры, але яны не ўзяты пад ахову дзяржавай. Мэта артыкула, зрабіць апісанне так званага “чорнага” дома, ці дома Мініна, які на нашу думку з’яўляецца помнікам драўлянага мадэрну, з мэтай падрыхтоўкі дакументаў для перадачы іх ў Беларускую рэспубліканскую навукова-метадычную раду па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь з мэтай надання яму статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Матэрыял і метады**. Матэрыяламі даследавання сталі палявыя даследаванні ў час правядзення практыкі. Выкарыстоўваліся візуальны, апісальны метады, праца ў архіве, метад інтэрвью.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Архітэктурны стыль мадэрну атрымаў распаўсюджанне ў Еўропе ў 1890–1910-я гг., у межах мастацкага накірунку мадэрн. Архітэктуры мадэрну ўласціва адмова ад прамых ліній і вуглоў, выкарыстанне новых тэхналогій у будаўніцтве. Значная ўвага надавалася не толькі знешняму выгляду будынку, але і інтэр’еру. Усе канструкцыйныя элементы: лесвіцы, дзверы, слупы, балконы мастацкі апрацоўваліся. Агульнадаступнасць, таннасць, камфорт сталі асноўнымі прынцыпамі ўзвядзення будынкаў дзякуючы вынаходніцтвам навукі і тэхнікі. Найбольш выдатнымі помнікамі рускага мадэрну з’яўляюцца сядзібныя дамы Марозава (1893–1898), Рабушынскага (1903) у Маскве, друкарня “Утро России” на Страстным бульвары (1907), сядзібныя комплексы ў Талашкіна Смаленскай вобласці, Абрамцава ў Падмаскоўі.

У Беларусі найбольш яскравымі помнікамі мураванай архітэктуры мадэрну з’яўляюцца сядзіба Гатоўскіх у в. Красны Бераг Жлобінскага раёну, будынак былога Віленскага камерцыйнага банка (1910) і Руска-Азіяцкага банка (1912) у Гомеле, дом доктара Тальгейма (1911) у Гродна, сядзібны дом у Крупках (пач. XX ст.) і іншыя. У Віцебску – будынак Сялянскага пазямельнага банка, будынак Земляробчага вучылішча ў Лужасна.

Значна меней у архітэктуры Беларусі прадстаўлены драўляныя будынкі. Элементы стылю мадэрн можна знайсці ў будынку Прачысценскай царквы (1912) у Шаркоўшчыне, Пакроўскай царквы ў в. Асінгарадок (пач. XX ст.) Пастаўскага раёну. Найвыдатнейшым помнікам архітэктуры драўлянага мадэрну з’яўляецца сядзіба Прушынскіх у Лошыцы і будынак купчыхі Кацнэльсон у Бабруйску (1912) [1]. Пэўныя рысы мае сядзіба Бутоўт-Андрэйкавічаў “Багудзёнкі” у в. Поразава Гродзенскай вобласці, сядзіба Мяшчэрскіх у Клімавічах (1876) Магілёўскай вобласці, сядзіба ў в. Галавічполле (1935) Шчучынскага раёну. На жаль, страчана сядзіба Мілашэўскіх у Чарапоўшчыне Ушацкага раёна, якая згарэла некалькі гадоў таму.

У Віцебску захаваўся драўляны будынак, які можна аднесці да яркіх прыкладаў архітэктуры мадэрна. Гэта, так званы “чорны” дом, ці “дом Мініна”, які знаходзіцца на вуліцы 1-я Даватара.

Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя дома складаецца з трох роўнавялікіх аб'ёмаў першага паверху і надбудовы ў выглядзе мезаніна над сярэдняй часткай дома. Цокаль дома крыху выступае за плоскасць сцяны, абкладзены дэкаратыўным каменем. Сцены дома складзены з бярвення, вуглы зашыты вертыкальнымі дошкамі, якія ў карніза дэкараваны прапільной накладной разьбой. Скаты даху завяршаюцца падшыўнымі карнізамі, якія падтрымліваюцца разнымі кранштэйнамі з кроплепадобнымі завесамі. Ніжэй лініі кранштэйнаў праходзіць фрыз у выглядзе паўтараючыхся пірамідападобных элементаў (у мураванай архітэктуры – канверт ці брыльянтавы руст).

Фасадныя дзверы маюць дзве створкі, кожная з якіх складаецца з трох прамавугольных прафіляваных філёнак з фрызамі складанай канфігурацыі. Над дзвер'ю прарэзана прамавугольнае вакно для натуральнага асвятлення ўнутранай прасторы.

Фасад амаль сіметрычны адносна галоўнай вертыкальнай восі дома. Уваходныя дзверы з казырком размешчаны ў правай частцы будынку, што прыўносіць некаторую асіметрыю. Вокны першага паверху маюць розныя памеры: найбольш шырокія размяшчаюцца ў цэнтральнай частцы фасада, вузкія – у бакавых частках. Аконныя праёмы ў мезаніне маюць меншыя памеры і размешчаны па абодвух баках балконнай дзверы. У трохкутным франтоне, па вертыкальнай васі будынка зроблена слухавое вакно.

Дэкор сцен будынка просты, але ўпрыгожаны шматлікімі элементамі ў стылі мадэрн, якія перапрацаваны майстрамі ў адпаведнасці з законамі і з прыстасаваннем да драўлянай архітэктуры [2].

Вокны і балконная дзвер упрыгожаны ліштвамі. Бакавыя часткі іх заканчваюцца завесамі крывалінейнай формы. Некаторыя вертыкальныя элементы рамы ўпрыгожаны разной дэкаратыўнай накладной балкай. Над дзвярыма маецца металічны казырок выкананы ў тэхніцы мастацкай коўцы ў выглядзе стылізаваных раслін.

Адсутнасць выкшталцоных форм, крывізна даху, разрэзка вокнаў не адпавядаюць класічным прыкладам мадэрну. Аднак, архітэктурны стыль, у якім пабудаваны дом несумненна можна вызначыць, як драўляны мадэрн.

Дом знаходзіцца на вуліцы 1-я Даватара, 20. З'яўляецца адным з самых старых драўляных будынкаў у горадзе Віцебску [3]. Мясцовая назва – "чорны" дом, ці дом Мініна. Апошняя звязана з тым, што ў ім з 1931 г. здымаў кватэру Ефім Мінін. Вядомы мастак, гравёр, ілюстратар Е. Мінін нарадзіўся ў Віцебску ў стараверскай сям'і. Вучыўся ў мастацкай школе Ю. Пэна, потым у Саламона Юдовіна. Працаваў пераважна ў тэхніцы ксілаграфіі, займаўся ілюстраваннем выданняў, экслібрысам. Расстраляны ў 1937 г. па справе Польскай арганізацыі вайсковай (ПОВ). Рэабілітаваны ў 1958 годзе. Працы Я. Мініна захоўваюцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі (Мінск), Дзяржаўным музеі выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна (Масква).

Уласнік невядомы. Выкарыстоўваецца як жылы дом. Сучасны стан здавальняючы. Вядома, што жыхары дома раней выступалі з ініцыятывай надаць яму статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, аднак безвынікова.

**Заключэнне**. Такім чынам, "чорны" дом, ці дом Мініна, з'яўляецца рэдкім узорам створанага чалавекам асяроддзя, творам народнага мастацтва канца XIX – пачатку XX ст [4]. Драўляны дом - гэта неад'емная частка каларыту беларускага горада як маленькага так і вялікага. Улічваючы ролю, якую адыгрываў дом яго жыхары ў гісторыі Віцебска, рэдкасць у архітэктурным плане, значнасць падзей, якія звязаны з домам, лічым неабходным ўзяць будынак № 20 па вуліцы 1-я Даватара пад ахову дзяржавы як гісторыка-культурную каштоўнасць 3-й катэгорыі.

Спіс літаратуры

1. Бабруйск // Livejournal. Электронны рэсурс. Рэжым карыстання: http://darriuss.livejournal.com/563668.html?thread=5649620. Дата доступу: 12. 10.2015 г.
2. Индивидуальное задание Багдасарова Е.Э. // Отчет по итогам проведения историко-краеведческой практики 2015 г. Багдасарова Е.Э. // Захоўваецца на кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава
3. « Прогулки по незнакомому Витебску». Улица, где размещена «Погоня» и находится служебный спецдом // tut.by. Электронны рэсурс. Рэжым карыстання: http://news.tut.by/society/428908.html. Дата доступу: 10.12. 2015 г.
4. Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь. [Электронны рэсурс]. Рэжым карыстання: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=h10600098&p2={NRPA}. Дата доступу: 18.12. 2015 г.



Репозиторий ВГУ